Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



**Алена Дзенісенка**

# Кнігазбор акадэміка Гаўрылы Гарэцкага

## ў фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

*Прымеркавана да года навукі ў Беларусі*

**Асабісты кнігазбор Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага доўгі час захоўваўся ў інстытуце геахіміі і геафізікі НАН Беларусі. Яго сын, акадэмік НАН Беларусі, геолаг, геатэктонік Радзім Гарэцкі падарыў ЦНБ НАН Беларусі бібліятэку свайго бацькі, дапоўненую кнігамі са сваёй бібліятэкі. Кнігазбор акадэмікаў Гарэцкіх паступіў у ЦНБ НАН Беларусі ў сакавіку 2008 года. Сёння ён размешчаны асобнай калекцыяй у кнігасховішчы аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў пад шыфрам «КГор».**



Г. І. Гарэцкі.

Кнігазбор акадэмікаў Гарэцкіх уяўляе сабой звычайную бібліятэку навукоўца-геолага. У сваёй асноўнай частцы яна сфарміравана адпаведна з навуковымі інтарэсамі яе ўладальнікаў і адлюстроўвае іх прыхільнасць да пэўнага напрамку даследаванняў. У дадзеным выпадку гэта даследаванні па геалогіі антрапагена, стратыграфіі, палеаграфіі, палеанталогіі, геамарфалогіі, гідрагеалогіі, інжынернай геалогіі, археалогіі.

У кнігазборы вучоных звыш 3 000 назваў. Ён прадстаўлены не толькі кнігамі, але і перыядычнымі выданнямі, арыгінальнымі адбіткамі, аўтарэфератамі кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Бібліятэку ўмоўна можна падзяліць на два раздзелы. У першым захоўваюцца выданні, звязаныя з прафесійнай дзейнасцю вучоных. У другі ўвайшлі кнігі беларускіх літаратуразнаўцаў з аўтографамі і дарчымі надпісамі. Самыя раннія з кніг — «Инструкции…», выдадзеныя ў друкарні Імператарскай Акадэміі навук Санкт-Пецярбурга ў 1896—1898 гадах («Инструкция для исследования и описания рек» (1896), «Инструкция для исследования морских берегов» (1898), «Инструкция для исследования характера и распространения летучих песков» (1898)). Гаўрыла Гарэцкі пакінуў вялікую спадчыну ў многіх галінах навукі. Яго даследаванні ў выглядзе манаграфій, артыкулаў, справаздач і іншых матэрыялаў адлюстроўваюць погляды вучонага на прыродныя багацці антрапагенавага перыяду. Свае даследаванні па гэтай тэме дасылалі вучонаму яго калегі з усіх канцоў Савецкага Саюза. Дарчыя надпісы сведчаць пра адносіны паміж вучонымі, падкрэсліваюць аўтарытэт Гаўрылы Іванавіча сярод паплечнікаў і вучняў.

У кнігазборы ёсць навуковыя кнігі з дарчымі надпісамі ад калег, з якімі вучоны працаваў у розных галінах і на розных тэрыторыях. Пералік іх заняў бы шмат старонак і меў бы несумненную каштоўнасць для спецыялізаванага выдання, але ў гэтым артыкуле, адрасаваным колу адухоўленых чытачоў, варта засяродзіцца на ўнёску культурным, пісьменніцкім.

На працягу ўсяго жыцця Гаўрыла Гарэцкі адчуваў велізарны інтарэс да культурнага жыцця Беларусі, у прыватнасці, меў стасункі з многімі пісьменнікамі, сярод якіх шмат з кім сябраваў. Калі ў Маскве праводзіліся дэкады беларускай літаратуры і культуры, Гарэцкі часта наведваўся на гэтыя мерапрыемствы, з цікавасцю слухаў выступленні і нават крытычна іх ацэньваў. Аднойчы, напрыклад, пісаў сваёй жонцы Ларысе Восіпаўне: «Паэты выбралі для чытання ў большасці старыя творы ды і чыталі іх не ўсе па-майстэрску. А. Куляшоў добра прачытаў верш «Да аб'яднаных нацый», але мог бы выбраць нешта больш мастацкае… П. Панчанка чытаў кепскавата, хоць і добры верш пра высотны дом. П. Глеб-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



ка таксама невыразна прачытаў верш пра мір. К. Крапіва кепска чытаў, прачытаў стары верш пра асла і сонца. К. Кірэенка тэатральна, але не вельмі ўмела, прачытаў вялікі стары верш, які ён раней чытаў у гэтай зале… М. Танк чытаў без захаплення, глухім голасам, свой стары верш, які сказаў добра: "А хто вецер пасее — той буру пажне". У лісце ад 24.03.1979 г. да пляменніцы Галіны Максімаўны Гарэцкай вучоны распавядаў пра вечарыну з Васілём Быкавым. Але ж не ўтрымаўся ад заўваг у адрас пісьменніка: «Многа было пісулек, цікава адказваў В. Быкаў. Але шматразовае так сказаць (хаця б так кажучы) страшэнна засмечвала мову, псавала яе».

У кнігазборы Гарэцкіх шмат кніг, атрыманых у дар ад Якуба Коласа, Уладзіміра Дубоўкі, Уладзіміра Караткевіча, Максіма Лужаніна, Максіма Танка, Ніла Гілевіча і інш. У Мінску, куды вучоны пераехаў у 1968 годзе, прайшлі яго апошнія дваццаць гадоў, якія сын вучонага Радзім Гарэцкі характарызуе як «самыя светлыя, спакойныя і плённыя» ў багатым на крутыя павароты бацькавым жыцці. Гаўрыла Іванавіч часта прыходзіў у Саюз пісьменнікаў на літаратурныя вечары, наведваў калі не ўсе, дык многія тагачасныя тэатральныя прэм'еры і некаторыя шараговыя спектаклі — увогуле цікавіўся ўсім, што адбывалася ў культуры.

Вучоны не толькі выдатна ведаў і горача любіў родную літаратуру, але і сам быў аўтарам многіх артыкулаў і ўспамінаў на літаратуразнаўчыя і мовазнаўчыя тэмы. Яго публікацыі прысвечаны брату-пісьменніку Максіму Гарэцкаму, Янку Купалу, Якубу Коласу, Уладзіміру Дубоўку і іншым, з кім вучоны быў добра знаёмы.

Даўнім сябрам Гаўрылы Гарэцкага быў паэт Уладзімір Дубоўка. Яны ў адзін час жылі і вучыліся ў Маскве: Гарэцкі — у Цімiразеўскай акадэміі, Дубоўка — у Брусаўскім інстытуце. Гарэцкі па заканчэнні навукі вёў кафедру ў Горках, потым стаяў на чале інстытута ў Мінску. Дубоўка заставаўся жыць у Маскве, але часта прыязджаў у Мінск. Ён уваходзіў у кіраўніцтва «Маладняка», наладжваў працу новага літаратурнага згуртавання «Узвышша» (1926—1930), часта друкаваўся і быў адным з рэдактараў аднайменнага часопіса. У адзін з прыездаў у беларускую сталіцу паэт падарыў вучонаму сваю кніжку «Жёлтая акация» (М., 1970) з аўтографам: «Дарагім Г. І. і Л. В. Гарэцкім на памяць, ад шчырага сэрца. 15/02.71. Масква. Ул. Дубоўка».

З Якубам Коласам Гарэцкага ў 1924 годзе пазнаёміў яго родны брат Максім. Якуба Коласа і братоў Гарэцкіх аб'ядноўвала сумесная праца ў камісіях і секцыях Інбелкульта, разам яны прымалі ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных Першай беларускай акадэмічнай канферэнцыі па




Дарчы надпіс Ядвігі Раманоўскай, пляменніцы Янкі Купалы.




Дарчы надпіс Г. І. Гарэцкага сыну Радзіму Гарэцкаму.




Дарчы надпіс Ніла Гілевіча.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by


рэформе беларускага правапісу. Пасля рэарганізацыі ў 1928 годзе Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук першымі паўнамоцнымі членамі акадэміі былі зацверджаны Якуб Колас, Янка Купала і Гаўрыла Гарэцкі. У гады Вялікай Айчыннай вайны вучоны працаваў у «Гідрапраекце». Падчас камандзіровак у Маскву ён сустракаўся з Якубам Коласам. Доўгі час паміж імі вялося ліставанне. Якуб Колас хадайнічаў аб вяртанні Гаўрылы Гарэцкага ў Беларусь, але безвынікова. Ён вельмі шанаваў Гарэцкага. У 1945 годзе Гаўрыла Іванавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю, а на другі год — доктарскую (абарона праходзіла ў Інстытуце геалагічных навук АН СССР у Маскве). Дзве гэтыя падзеі былі адсвяткаваны ў гасцініцы, дзе жыў Якуб Колас, разам з беларускімі пісьменнікамі.

Якуб Колас дасылаў Гаўрылу і яго жонцы Ларысе свае новыя кнігі. Пясняр падарыў Гарэцкім экзэмпляр паэмы «Рыбакова хата», якая выйшла ў Дзяржвыдавецтве БССР, з наступным надпісам: «Маім мілым, дарагім землякам Ларысе і Гаўрылу Іванавічу Гарэцкім на добрую памяць. 25.XII.1947 г.».

У цяжкі час, калі Гаўрыла і Максім Гарэцкія афіцыйна лічыліся «ворагамі народа», іх жонак Ларысу Восіпаўну і Леанілу Усцінаўну падтрымлівалі Янка Купала і яго жонка Уладзіслава Францаўна. Многім рызыкуючы самі, яны не адвярнуліся і дапамагалі, чым маглі. Пасля выхаду з няволі, праз гады, Гаўрыла Гарэцкі ў сваёй кнізе ўспамінаў пра Янку Купалу пісаў: «У 1918 годзе ў Смаленску жыў і Янка Купала з маладою жонкаю Уладзіславай Францаўнай, жылі яны на Малой Багаслоўскай вуліцы, у прыдалінай частцы горада, у аднапавярховым доме. Купала досыць часта запрашаў Максіма ў госці, брат і мяне браў з сабою. Хоць і цяжка жылося ў той час, але Уладзіслава Францаўна заўсёды была выключна гасціннай і жыццярадаснай». Гаўрыла Іванавіч вельмі цяжка ўспрыняў загадкавую смерць песняра. Па меры магчымасці вучоны наведваў жонку паэта. У лісце да Ларысы Восіпаўны ад 25.05.43. Гарэцкі адзначыў: «Быў у Купаліхі. Шмат чаго яна апавядала мне пра апошні год жыцця Купалы. Якія цяжкія ў яго былі перажыванні — ад фізічных хвароб і іншых». У другім лісце — ад 17.06.43., дасланым жонцы з Масквы, Гарэцкі распавядаў: «Учора быў я ў гасьцёх у цёткі Уладзіславы, якая жыве ў гасьцініцы «Масква». Добра пагаманілі. Успамінае яна ўсё Янку, яго апошнія гады. Паказала мне ўсе яго апошнія карткі. Як-небудзь паедзем у крэматорый, укланіцца праху вялікага нашага песьняра-прарока…».

У кнігазборы Гарэцкіх захоўваецца Збор твораў Янкі Купалы ў сямі тамах (Мінск, 1975—) і каштоўнае пасмяротнае выданне выбраных твораў паэта (М., 1943) пад агульнай рэдакцыяй Якуба Коласа. Таксама цікавы зборнік вершаў Янкі Купалы (Мінск, 1978) з дарчым надпісам: «Даражэнькім Гарэцкім у дзень юбілея Гаўрылы Іванавіча на добрую памятку ад родных Янкі Купалы. Красавік 1980 г., Мінск. Ядвіга Раманоўская». Гэта падарунак пляменніцы паэта.

А вось некаторыя прыклады дарчых надпісаў ад дзеячаў беларускай культуры ў кнігазборы Гаўрылы Гарэцкага….

«Шаноўнаму Гаўрылу Іванавічу Гарэцкаму. З вялікаю павагаю пасылаю на памяць гэтую кніжку. Шкада, што няма на роднай мове. Спадзяюся паправіць у другі раз. Пятрусь Броўка. VII.1968 г.» — на кнізе «Всегда с тобой» (М., 1967).

Гаўрыла Іванавіч неаднойчы прызнаваўся, што яму вельмі падабаюцца творы Янкі Брыля. На кнізе «Сёння і памяць: Апавяданні, мініяцюры, эсэ» (Мінск, 1985) надпіс: «Дарагім Ларысе Восіпаўне і Гаўрылу Іванавічу — з глыбокай павагай. 11.07.85. Я. Брыль. 11.07.85». На кнізе «Сад: Кніга польскіх апавяданняў» (Мінск, 1982) таксама надпіс: «Дарагому Гаўрылу Іванавічу на добрае здароўе! Я. Брыль. 17.X.82».

Васіль Быкаў у сваім выданні «Праўдай адзінай: Літ. крытыка, публіцыстыка, інтэрв'ю» (Мінск, 1984) пакінуў такі надпіс: «Дарагой для беларускай літаратуры сям'і Гарэцкіх з удзячнасцю і вялізнай павагай — аўтар. В. Быкаў. 1.XII.84».

Дарчы надпіс ад Васіля Віткі: «Дарагому Гаўрылу Іванавічу з глыбокай пашанай да выдатнага і слаўнага роду Гарэцкіх. Васіль Вітка. 15 кастрычніка 1973» — на кнізе «Выбраныя творы. Т. 1. Вершы, паэмы, казкі» (Мінск, 1973). На кнізе В. Шэкспіра «Антоній і Клеапатра: Трагедыя.» (Мінск, 1982) — ад жонкі Гаўрука Таццяны Міхайлаўны: «Дарагім Ларысе Восіпаўне і Гаўрылу Іванавічу Гарэцкім з даўняй прыязняй і зычлівасцю на ўспамін пра Юрыя Паўлавіча, які заўсёды любіў Вас і захапляўся Вамі. Таццяна Гаўрук».

Гаўрыла Гарэцкі захапляўся творамі Ніла Гілевіча. У сваю чаргу паэт і публіцыст выказваў самую


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by




41

Браты М. і Г. Гарэцкія.

МАСКОЎСКА - БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК.

ВЫДАНЬНЕ II.

(З папраўкамі і вялікімі дадаткамі).

Вільня 1920 г.

шчырую сардэчную прыхільнасць і павагу да сям'і Гарэцкіх і іх плённай дзейнасці на ніве беларускай навукі і культуры. У кнігазборы Гарэцкіх восем кніг ад Ніла Гілевіча. На кнізе «Песні сямі вёсак. Традыцыйная народная лірыка Міншчыны» (Мінск, 1973) дарчы надпіс: «Вельмі шаноўным Ларысе Восіпаўне і Гаўрылу Іванавічу Гарэцкім ад укладальніка, якому ў працы над гэтай кнігай свяціў вялікі прыклад Максіма Іванавіча. З сардэчнай павагай і самымі добрымі пажаданнямі. 1973. Н. Гілевіч.»; на кнізе «Лірычныя песні» (Мінск, 1976): «Сям'і Гарэцкіх — слаўным і прыгожым людзям, чыю прысутнасць у беларускай культуры я ўспрымаю і адчуваю як жывы запавет вялікіх. Здароўя Вам і душэўнай моцы, дарагія Гаўрыла Іванавіч і Ларыса Восіпаўна! 21.X.76. Н. Гілевіч».

Шчырым прыхільнікам таленту Гарэцкага быў Уладзімір Караткевіч. На першай старонцы яго вершаванай кнігі «Мая Іліяда» (1969) ёсць такі надпіс: «Дарагому Гаўрылу Іванавічу — ад шчырага пачытальніка рэдкага ягонага таленту — Уладзіміра Караткевіча. 17 лістапада 71 г. Менск».

Сярод аматараў беларускай літаратуры вялікую цікавасць выклікаў выхад у свет у 1978 годзе кнігі Максіма Лужаніна «З ранку да вечара. Роздумы, водгукі, накіды партрэтаў». Гэты твор захоўваецца ў бібліятэцы Гаўрылы Іванавіча з такім надпісам: «Паважанаму Г. І. Гарэцкаму. Прыміце і гэту сціплую лісціну ў вянок памяці самага першага, незабыўнага Максіма. 9.XII.78». Аб глыбокай пашане з боку Лужаніна сведчаць і яго надпісы на іншых кнігах з асабістай бібліятэкі вучонага: «Дарагі Гаўрыла Іванавіч! Кніжыца — тонкая, многа месца на паліцы не адбярэ, калі заслугоўвае, вядома. М. Лужанін. 15.IV.85» — на кнізе «Начало человека» (М., 1984); «Вялікага плёну і спору ў нашай добрай дарозе! Г. І. Гарэцкаму душэўна М. Лужанін. 21.VII.73» — на кнізе «Рэпартаж з рубцом на сэрцы» (Мінск, 1972). У кнігазборы налічваецца восем кніг з дарчымі надпісамі Максіма Лужаніна.

Ад Адама Іосіфавіча Мальдзіса — сем кніг з аўтографамі. У 1977 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў нарыс Мальдзіса «Астравеччына, край дарагі...». Аўтар падарыў яго Гарэцкаму з такім надпісам: «Шаноўнаму Гаўрылу Іванавічу — гэту часціну Беларусі — з павагай і сімпатыяй уручае аўтар А. Мальдзіс. 12.9.77 г.» Самы ранні надпіс ад літаратуразнаўца — на кнізе «Таямніцы старажытных сховішчаў. Да гісторыі беларускай літаратуры XVII—XIX стагоддзяў» (Мінск, 1974): «Паважаным Ларысе Осіпаўне і Гаўрылу Іванавічу Гарэцкім з сардэчным навагоднім віншаваннем — А. Мальдзіс. 31/XII—74».

Цёплыя дачыненні звязвалі Гаўрылу Іванавіча з Максімам Танкам. Кніга «Лісткі календара» (1970) займае ў яго творчасці асаблівае месца. Гэтая кніга была падорана вучонаму з наступным надпісам: «Глыбокапаважанаму Гаўрылу Іванавічу Гарэцкаму на добры ўспамін. Ад усяго сэрца. Максім Танк. Мінск, 21/IX.1970». Ці вось яшчэ: «Глыбокапаважанаму Гаўрылу Іванавічу Гарэцкаму — з любоўю і найлепшымі пажаданнямі. Максім Танк. Мінск. 17/XII. 1976» — на кнізе «Дарога, закалыханая жытам. Вершы» (Мінск, 1976). Максім Танк зрабіў надпіс і на кнізе вершаў «Лірыка» (1987) — адрасаваны жонцы Г. І. Гарэцкага: «Глыбокапаважанай Ларысе Восіпаўне Гарэцкай. Ад усяго сэрца. Максім Танк. Мінск, 17.III.1990 г.».

Больш чым шэсць дзесяцігоддзяў налічвала сяброўства Гаўрылы Гарэцкага і беларускага пісьменніка Станіслава Шушкевіча. У кнігазборы налічваецца дваццаць тры кнігі паэта з аўтографамі. У 1983 годзе ў выдавецтве «Мастацая літаратура» ў серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі» выйшла кніга С. Шушкевіча «Дарога ў залатую восень». Яе аўтар падарыў сям'і Гарэцкіх і надпісаў: «Дарагім Ларысе Восіпаўне і Гаўрылу Іванавічу, маім найлепшым суседзям, дом якіх заўсёды бачу праз шыбу свайго вакна, якім мне хочацца заўжды выказаць павагу і добразычлівасць. С. Шушкевіч. 28 мая 1983 г.» Самыя раннія аўтографы Шушкевіча — на кнізе вершаў «Лясная калыханка» (Мінск,



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by






Штамп бібліятэкі Г.І. Гарэцкага.

1958): «Гаўрылу Іванавічу Гарэцкаму са шчырым пачуццём і самымі найлепшымі пажаданнямі. Станіслаў Шушкевіч. 20.XII.1959», на кнізе «Сарочы церамок» (Мінск, 1959): «Гаўрылу Іванавічу на добры ўспамін. Станіслаў Шушкевіч. 20.XII.1959», на кнізе «Мы на змену ідзём» (Мінск, 1961): «Гаўрыла Іванавіч! Буду сардэчна рад, калі знойдзеце ў гэтай кніжцы цікавае для Вашых унукаў. Станіслаў Шушкевіч. 28.XII.1961».

Да свайго 75-годдзя Гаўрыла Гарэцкі атрымаў ад беларускіх паэтаў зборнік вершаў «Слухайце — Хатынь. Слушайте — Хатынь» (Мінск, 1975). На тытульным лісце яго зафіксаваны 32 подпісы, сярод якіх аўтографы А. Астрэйкі, К. Кірэенкі, П. Панчанкі, А. Зарыцкага, С. Грахоўскага, М. Лужаніна, К. Цвіркі, П. Прыходзькі, Г. Бураўкіна, Н. Гілевіча, М. Танка, А. Бачылы, А. Вялюгіна, Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, Э. Агняцвет, П. Броўкі, У. Калесніка і інш. Разам з імі свой подпіс паставіў намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў БССР празаік Іван Шамякін.

Цікавасць і любоў да роднай мовы і літаратуры Гаўрыла Іванавіч пранёс праз жыццё. Ён быў цудоўным знаўцам творчай спадчыны свайго брата. У 1917—1918 гадах яны разам склалі «Руска-беларускі слоўнік», які выйшаў у 1918 годзе ў Смаленску, а пазней і ў Вільні (1921). Гэта быў першы беларускі слоўнік такога тыпу, надрукаваны пасля рэвалюцыі, і першы вопыт братоў у галіне лексікаграфіі, паспяхова прадоўжаны Інстытутам беларускай культуры.

Гаўрыла Гарэцкі рабіў усё, што мог, для вяртання спадчыны брата Максіма Гарэцкага. Ён быў вельмі ўдзячны прафесару філалогіі Дзмітрыю Бугаёву за выданне невялічкай, але змястоўнай манаграфіі «Максім Гарэцкі» (1968). Саюз пісьменнікаў Беларусі стварыў Камісію па літаратурнай спадчыне Максіма Гарэцкага. Гаўрыла Гарэцкі дапамагаў складанню Збору твораў Максіма Гарэцкага ў чатырох тамах (1984—1986), які пазней быў дапоўнены «Творамі» (1990) і «Гісторыяй беларускай літаратуры» (1992).

У кнігазборы Гарэцкіх захоўваюцца кнігі ад сваякоў, сяброў і знаёмых. Кніжкі ад жонкі Ларысы Восіпаўны захоўваюць такія надпісы: «Гурыку ад Лары. 10/IV 47» у кнізе М. Садковіча і Я. Львова «Георгій Скарына» (Мінск, 1946); «Дарагому Гурыку на дзень 10/IV 47. Лара» — у кнізе К. Чорнага «Трэцяе пакаленне» (Мінск, 1946); «Майму любаму Гурыку, самаму заўзятаму грыбніку, у знак падзякі і ўзнагароды за сёлетнія грыбныя посьпехі. Лара. 7.X.67. Дзедаўск» — у кнізе Б. Васількова «Белый гриб. Опыт монографии одного вида» (М., 1966); «У памяць тваёй добрай мамы, Гурык, хай будзе і гэтая кніжка. 13.V.77. Лара» — у кнізе У. Васілевіча «Дзень добры, мама! Словы адданасці і любові» (Мінск, 1977).

У кнігазборы ёсць кнігі ад сыноў — з надпісам: «Маме і тату ад сыноў. 18/VI—48 г.» — на кнізе «За Советскую Белорусь. Белорусская литература в Великой Отечественной войне» (М., 1942); ад сваячкі Эстэр Зіноўеўны Валовік (Тусі): «Дорогому Гурику. Туся. 10/IV-47 г.» — на кнізе М. Страхава «Историческая геология» (М., 1938), «Дорогому Гурику. Будь всегда весел и счастлив. Туся. [Б. д.]» — на кнізе А. Русака «Закрасуйся, Нёман. Песні, лірыка, гумар» (Мінск, 1978). Яшчэ некалькі выданняў, падораныя Ларысе Восіпаўне яе сяброўкай Яўгеніяй Саламонаўнай Кац. На кнізе Якуба Коласа «Избранное» (М., 1946) дарчы надпіс: «Дорогая Лариса Иосифовна, поздравляю, желаю Вам всего, всего хорошего. Хорошо, если эта книга сможет доставить Вам пару тёплых минут воспоминаний о родном уголке. Ваша Женя. 13/III—47 г.». У даследаванні «Некоторые методы определения физико-механических свойств грунтов (Пособие для грунтовых лабораторий). [Под ред. проф. В. В. Охотина] дарчы надпіс: «В знак того, что я все время Вас помню, даже когда ничего не пишу. Уваж. Ларисе Иосифовне. [Аўтограф подруги Е. С. Кац]. 20/XII-50 г.».

Каля 2 000 кніг з аўтографамі і дарчымі надпісамі захоўваецца ў кнігазборы Гарэцкіх. Ён адкрыты абсалютна для ўсіх, хто цікавіцца дзейнасцю Гаўрылы Гарэцкага, вялікага Чалавека, класіка прыродазнаўства, які падарыў жыццё служэнню Навуцы.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by